

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №1
Верасень 2019

## Урачыстая лінейка, прысвечаная Дню ведаў “Вітаем новы навучальны год”



2 верасня ва ўсіх установах адукацыі нашай краіны празвінеў першы званок, азнаменаваўшы пачатак новага навучальнага года.

У цэнтры ўвагі на лінейцы – першакласнікі: Барысевіч Багдан, Барысевіч Варвара, Данец Цімафей і Кулікоўскі Яўген; і выпускнік Епіфанаў Глеб. Былыя выхаванцы дзіцячыга садка старанна чытаюць вывучаныя вершы, а затым уважліва слухаюць свайго старэйшага сябра.

Дырэктар школы Аляксандр Сяргеевіч Крыварот павіншаваў выпускніка 2020 году Епіфанава Глеба, пажадаў першакласнікам раўняцца на выпускніка, а ўсім навучэнцам, настаўнікам, бацькам - новых поспехаў і дасягненняў.



## НОВЫ 2019-2020 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД



На ўрачыстай лінейцы прысутнічалі ганаровыя госці:

Кунц Вадзім Уладзіміравіч – дырэктар філіяла “Фалько-Агро” ААТ “Агракамбінат “Дзяржынскі”;

Лобач Уладзімір Іосіфавіч – старшыня Фаніпальскага сельскага выканаўчага камітэта;

Лузан Іван Антонавіч – старшыня раённага прафкама работнікаў аграпрамысловага комплексу.

Дырэктар і ганаровыя госці ўручылі першакласнікам падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На старонках выдання “Беларусь – наша Радзіма” адлюстраваны ўсе сучасныя дасягненні беларусаў: ад эканомікі да навукі і спорту. Сотні ілюстрацый раскажуць школьнікам пра гісторыю, геаграфію і праслаўленых людзей нашай Радзімы.










# «Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі!»

Гэтыя выдатныя словы песняра беларускага народа Янкі Купалы выбраны тэмай першага ўрока. Словы сугучныя з тэмай Года малой радзімы, падкрэсліваюць суверэнітэт і незалежнасць Рэспублікі Беларусь.

Пад такім дэвізам прайшоў першы ўрок новага навучальнага года ў пачатковай школе…





… і ў вучняў старэйшага звяна.



**НОВЫ 2019-2020 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД**

**НОВЫ 2019-2020 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД**



# Шосты школьны дзень

## 7 верасня – Дзень турызма









Што для вас бег? А Мінскі паўмарафон? Для сарака тысяч людзей, якія беглі разам па цэнтральных праспектах сталіцы 15 верасня, гэта зарад энергіі, матывацыя быць лепшым, невымоўныя ўражанні і, нарэшце, проста асалода!

Нашы вучні – удзельнікі Мінскага паўмарафона 2019.







## 14 верасня – Дзень піянерскіх спраў





Рэдкалегія: вучні 8 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 8 класа.